Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

ОРГАН САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ І КІРАЎНІЦТВА ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВА ПРЫ СОВЕЦЕ МІНІСТРАЎ БССР

№ 15 (565) | Чацвер, 9 мая 1946 г. | Цана 50 кап.

Няхай жыве Дзень Перамогі!
Слава гераічнаму совецкаму народу!
Слава Вялікаму СТАЛІНУ!

ЗАГАД

Міністра Узброеных сіл Саюза ССР

1 мая 1946 года *№ 7* *гор. Масква*

Таварышы чырвонаармейцы і чырвонафлотцы, сержанты і старшыны! Таварышы афіцэры, генералы і адміралы!

Працоўныя Совецкага Саюза!

Сёння, упершыню пасля пераможнага заканчэння Вялікай Айчыннай вайны, праводзім мы Першае Мая — міжнароднае свята працоўных — ва ўмовах мірнага жыцця, завяванага ў цяжкай барацьбе з ворагамі, цаною вялікіх ахвяр і нястач.

Год таму назад Чырвоная Армія ўзняла сцяг перамогі над Берлінам і завяршыла разгром фашысцкай Германіі. Праз чатыры месяцы пасля пераможнага заканчэння вайны з Германіяй склала зброю імперыялістычная Японія. Другая сусветная вайна, падрыхтаваная сіламі міжнароднай рэакцыі і развязаная галоўнымі фашысцкімі дзяржавамі, была закончана поўнай перамогай свабодалюбівых народаў.

Разгром і ліквідацыя асноўных асяродкаў фашызма і сусветнай агрэсіі прывялі да глыбокіх змен у палітычным жыцці народаў свету, да шырокага росту дэмакратычнага руху сярод народаў. Навучаныя вопытам вайны, народныя масы зразумелі, што лёс дзяржаў нельга давяраць рэакцыйным правіцелям, якія імкнуцца да вузка-каставых і карыслівых процінародных мэтаў. Іменна таму, народы, не жадаючы больш жыць па-старому, бяруць лёс сваіх дзяржаў у свае рукі, устанаўляюць дэмакратычныя парадкі і вядуць актыўную барацьбу супроць сіл рэакцыі, супроць падпальшчыкаў новай вайны.

Народы свету не жадаюць паўтарэння няшчасцяў вайны. Яны настойліва змагаюцца за ўмацаванне міру і бяспекі.

У авангардзе барацьбы за мір і бяспеку ідзе Совецкі Саюз, які адыграў выдатную ролю ў разгроме фашызма і выканаў сваю вялікую вызваленчую місію.

Народы, вызваленыя Совецкім Саюзам ад фашысцкага прыгнёту, атрымалі магчымасць будаваць сваё дзяржаўнае жыццё на дэмакратычных пачатках, ажыццяўляючы свае гістарычныя спадзяванні. На гэтым шляху яны сустракаюць з боку Совецкага Саюза брацкую дапамогу.

Увесь свет меў магчымасць пераканацца не толькі ў магутнасці совецкай дзяржавы, але і ў справядлівым характары яе палітыкі, заснаванай на прызнанні роўнапраўя ўсіх народаў, на паважанні іх свабоды і незалежнасці. Няма ніякіх падстаў сумнявацца ў тым, што Совецкі Саюз і надалей будзе верны сваёй палітыцы—палітыцы міру і бяспекі, палітыцы роўнапраўя і дружбы народаў.

Совецкі Саюз з заканчэннем вайны прыступіў да мірнага соцыялістычнага будаўніцтва. Совецкія людзі з натхненнем узяліся за мірную творчую працу, перарваную вайной.

Прыняты Вярхоўным Советам Совецкага Саюза Закон аб пяцігадовым плане аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1946—1950 гады адкрывае новыя перспектывы далейшага росту прадукцыйных сіл нашай Радзімы, росту яе эканамічнай магутнасці, уздыму яе матэрыяльнага добрабыту і культуры.

Рабочыя, сяляне і інтэлігенцыя нашай краіны ўспрынялі пяцігадовы план, як баявую праграму, якая адпавядае іх жыццёвым інтарэсам. Можна спадзявацца, што совецкія людзі, на чале з комуністычнай партыяй, не пашкадуюць сіл і працы для таго, каб не толькі выканаць, але і перавыканаць новую пяцігодку.

Разгортваючы мірнае соцыялістычнае будаўніцтва, мы ні на хвіліну не павінны забываць аб інтрыгах міжнароднай рэакцыі, якая вынашвае планы новай вайны. Неабходна памятаць указанні вялікага Леніна аб тым, што, перайшоўшы да мірнай працы, трэба заўсёды быць напагатове, берагчы, як зрэнку вока, узброеныя сілы і абароназдольнасць нашай краіны.

Узброеныя сілы Совецкага Саюза — нашы наземныя войскі, ваенна-паветраныя сілы і ваенна-марскі флот—выканалі свой абавязак перад Радзімай у Вялікай Айчыннай вайне.

Цяпер перад нашымі ўзброенымі сіламі стаіць не менш важная задача—пільна ахоўваць заваяваны мір і творчую працу совецкага народа, быць надзейнай апорай інтарэсаў Совецкага Саюза.

Паспяховае выкананне гэтай пачэснай задачы магчыма толькі пры ўмове далейшага росту ваеннай культуры і ваеннага майстэрства байцоў і камандзіраў нашай арміі, нашага флота, нашай авіяцыі.

Узброеныя сілы Совецкага Саюза павінны з дня ў дзень павышаць узровень свайго ваеннага майстэрства на аснове вопыта вайны, на аснове развіцця ваеннай навукі і тэхнікі.

Можна не сумнявацца, што наша армія, наш флот і наша авіяцыя выканаюць з гонарам задачы, якія стаяць перад імі.

Таварышы чырвонаармейцы і чырвонафлотцы, сержанты і старшыны! Таварышы афіцэры, генералы і адміралы!

Таварышы рабочыя і работніцы, сяляне і сялянкі, людзі інтэлігенцкай працы!

Воіны, дэмабілізаваныя з радоў Чырвонай Арміі!

Ад імя ўрада і комуністычнай партыі вітаю і віншую Вас з днём Першага Мая!

У адзнаку Міжнароднага свята працоўных—ЗАГАДВАЮ:

Сёння, 1 Мая, даць салют у сталіцы нашай Радзімы—Маскве, у сталіцах саюзных рэспублік, а таксама ў Львове, Кенігсбергу, у Хабараўску, Владзівастоку, у Порт-Артуры і ў гарадах-героях: Ленінградзе, Сталінградзе, Севастопалі і Адэсе—дваццаццю артылерыйскімі залпамі.

Няхай жывуць нашы доблесныя ўзброеныя сілы!

Няхай жыве наша слаўная комуністычная партыя!

Няхай жыве вялікі совецкі народ!

Няхай жыве наша магутная совецкая Радзіма!

Міністр Узброеных Сіл Саюза ССР
Генералісімус Совецкага Саюза
І. СТАЛІН.

ЗАГАД

Міністра Узброеных сіл Саюза ССР

9 мая 1946 года № 11 гор. Масква

Таварышы чырвонаармейцы і чырвонафлотцы, сержанты і старшыны! Таварышы афіцэры, генералы і адміралы!

Працоўныя Совецкага Саюза!

Сёння мы святкуем першую гадавіну вялікай перамогі нашага народа над фашысцкай Германіяй, якая пасягнула на свабоду і незалежнасць нашай Радзімы.

Ад імя Совецкага Урада і нашай комуністычнай партыі вітаю і віншую Вас з днём усенароднай урачыстасці — святам Перамогі над нямецкім фашызмам.

У адзнаку свята Перамогі ЗАГАДВАЮ:

Сёння, 9 мая, даць салют у сталіцы нашай Радзімы — Маскве, у сталіцах саюзных рэспублік, а таксама ў Львове, Кенігсбергу і ў гарадах-героях: Ленінградзе, Сталінградзе, Севастопалі і Адэсе — трыццаццю артылерыйскімі залпамі.

Слава нашым узброеным сілам, якія адстаялі чэсць і незалежнасць нашай Радзімы і заваявалі перамогу над гітлераўскай Германіяй!

Слава Усесаюзнай комуністычнай партыі — натхніцелю і арганізатару нашых перамог!

Слава нашаму вялікаму народу, народу-пераможцу!

Вечная слава героям, якія палі ў баях за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы!

Міністр Узброеных Сіл Саюза ССР
Генералісімус Совецкага Саюза
І. СТАЛІН.

На ўрадавай трыбуне 1 мая 1946 года ў г. Мінску. Злева направа: Ц. С. Гарбуноў, В. Н. Малін, П. А. Лявіцкі, Л. Ф. Цанава, П. К. Панамарэнка, С. Г. Трафіменка, К. В. Кісялёў, В. І. Казлоў, В. А. Горын, Н. Я. Наталевіч, Н. В. Кісялёў, Г. Б. Эйдзінаў, Н. Е. Аўхімовіч, В. С. Забела і Г. С. Лахтанаў.

Мы славім і працай і песняй крылатай

* * * * * *

Максім ТАНК.

ЛЕНІН і СТАЛІН

Гэта было даўно,
Як казка баіць,
Недзе над Дняпром ці над Беразіной,
Адным словам, было гэта ў нашым краю.

Прышлі Ленін і Сталін
Ад Крыўды народ бараніць.
А да Крыўды той не падступіць:
І шлях да яе круты,
І палац у яе залаты.
Ды абнесен палац той высокай сцяной,
Ды абкружан глыбокай вадой,
Ды абстаўлен вартай ліхой,—
Ледзь да Крыўды дапытацца,
Ледзь да яе дабрацца.

Даўно ўжо мінуў ранак.
І толькі пад поўдзень,
У залатым уборы,
Выйшла Крыўда на ганак.
Выйшла—усе пахіліліся да зямлі.
Толькі не схіліліся Ленін і Сталін.
Ленін гаворыць:
— Калі
Мы цябе, Крыўда, шукалі,
Дні і ночы ішлі
Праз рэкі і горы,
Праз землі, дзе ты збіраеш аброк
З старых і з малых,
З сірот гаротных,
З звяроў лясных,
Нават з птушак пералётных,—
Усюды бачылі гора...
— Дык чаго вы хочаце?—Крыўда спытала.
— Каб хутчэй ты пакінула нашы прасторы.
І так ужо досыць папанавала! —
Адказаў Сталін.

Здзівілася Крыўда: гэтак
З ёй ніхто не адважваўся гаварыць.
Перш хацела загадаць са свету
Двух волатаў зжыць,
Абкруціць ланцугамі...
Ды адумалася: лепш народ не гнявіць,
Лепш другімі шляхамі
Небяспеку ад сябе адхіліць.
— Што-ж, я не супроць,—
Крыўда кажыць.—
Толькі перш паглядзім,
Чыя сіла яшчэ пераважыць...
І кінула на вагу Крыўда
Чырвонага золата жменю.
Ніякіх скарбаў не ўзялі з сабой
У дарогу Ленін
І Сталін.
— Што палажыць?—задумаўся Ленін гаротна.

І, як дума цяжкая,
Апала
Кропля поту з яго чала.
Кропля цяжкая,
Бо пад ёй і вага, пахіснуўшыся,
Ападаць пачала.

Узлавалася Крыўда,
Загадала
Несці ўсе свае скарбы з падвалаў.
Прынеслі слугі бочкі срэбра.
Мала.
Прынеслі скрыні перлаў.
Мала.
Прынеслі крушні дарагога камення.
Мала.
І толькі калі навалілася Крыўда сама—
Грузная, цяжкая—
Памалу вага ападаць пачала.
А вага ападаць пачала,—
Ноч на нівы лягла.
А ноч на нівы лягла,—
Сцюжа лютая загула...
Ніякіх скарбаў не ўзялі з сабой
У дарогу Ленін і Сталін.
Была ў іх толькі дарожная торба,
З якой
Дастаў і палажыў на вагу Сталін
Чорнага хлеба акраец.
І, неспадзявана, бы глыба якая,
Хлеб, здабыты мазольнай рукой,
Абмыты вандроўнымі дажджамі,
Абсушаны дарожнымі вятрамі,
Усё пераважыў.
Вышэй і вышэй
Уздымаючы Крыўду пад сонца, якое
Яе і спаліла навекі,
А прах яе вецер развеяў
За высокія горы,
За цёмныя пушчы,
За сінія рэкі.

Пімен ПАНЧАНКА.

ГІМНАСЦЁРКА

З маленькаю латкай і локцем працёртым
Вісіць у кутку на цвіку гімнасцёрка—
Мая франтавая рэліквія.
З табой мы зазналі нямала нягодаў:
У дождж і завею—паходы, паходы,
Сутычкі і бітвы вялікія.
З бавоўны звычайнай, звычайна пашыта.
Чаму-ж гэтак цёпла было мне, скажы ты?
—Расла і цвіла я на родных палетках,
І шчодра паіла сцяблі́ны і кветкі
Гарачае сонца радзімы.
Хрыпела зямля, задыхаліся зоры.
Праз пекла прайшоў я і выжыў, а вораг
Засыпаны жвірам.
— Калі мяне пралі, калі мяне ткалі,
Дзяўчаты спявалі, ад сэрца жадалі,
Каб ты перамог
І з вялікіх дарог
Вярнуўся жывы і здаровы.
Я быў за мяжою, я рознае бачыў:
Багацце і гора, паноў і жабрачак.
Ды толькі заўсёды і ўсюды тужыў я
Па родных нябёсах: нашто мне чужыя!
Аддаў-бы я край самы райскі і дзіўны
За цень ад сасны на далёкай радзіме.
— Чыясьці матуля па сыне тужыла,
Калі апаўночы мяне яна шыла,
Слязой апаліла, цябе блаславіла
На вернасць.

Заслужаны дзеяч мастацтва БССР А. Бембель. Праект помніка К. Заслонаву.
Фота Г. Бугаенкі

Усесаюзны конкурс дырыжораў

У чэрвені 1946 г. у Ленінградзе адбудзецца Усесаюзны конкурс дырыжораў. З Беларусі на конкурс выедзе дырыжор тэатра оперы і балета Т. Каламійцава і дырыжор Радыёкамітэта С. Ратнер.

М. МОДЭЛЬ

Ждановіч у ролі Джульеты

Беларускі тэатр пражыў першы пасляваенны год багатым поўнакроўным жыццём. За гэты час у нашым мастацтве адбылося многа знамянальных падзей. Створаны выдатныя сцэнічныя вобразы ў сучасных і класічных спектаклях.

Агульныя рысы, што еднаюць гэтыя вобразы — іх сучаснасць, сугучнасць гуманістычнай, агульначалавечай тэмы нашай эпосе, іх накіраванасць супроць чалавеканенавісніцтва. Разам з тым, кожны з гэтых вобразаў жыве ў мастацтве зусім самастойна.

Увасабляючы на сцэне шэкспіраўскую Джульету, Ждановіч не імкнулася вытлумачыць лёс сваёй гераіні ідэяй антычнага Фатума. Яна не шукала прычыну трагедыі Рамэо і Джульеты ў пачуццёвай прыродзе закаханых сэрцаў. Ждановіч адхіліла таксама канцэпцыю «трагедыі сутычкі суб'ектыўнай волі з аб'ектыўнай нормай жыцця».

Вобраз, які ўвасобіла на сцэне Ждановіч, больш абагулены, і ён выходзіць за межы дачкі Вероны.

Сугучнасць Джульеты нашай эпосе вынікае з эмацыянальнага і філасофскага раскрыцця артысткай гуманістычнай тэмы трагедыі, якая вызначана Шэкспірам у заключнай сцэне: «Няма аповесці больш сумнай на свеце, чым аповесць аб Рамэо і Джульеце».

У сваім заключэнні Шэкспір ставіць асноўны акцэнт не на родавай варожасці Мантэкі і Капулеці. Гэтая варожасць—гістарычны фон трагедыі. Акцэнт зроблены геніяльным драматургам на самім каханні, на светлым і ўзнёслым пачуцці, якое ўласціва людзям ва ўсе часы і эпохі.

Так, на маю думку, зразумела ідэю трагедыі І. Ждановіч і такое шырокае разуменне твору вызначыла тэму яе Джульеты.

Джульета-Ждановіч—уся ў палоне свайго велічнага і прыгожага пачуцця. Гэтае пачуццё захапляе ўсю яе маладую істоту, цалкам паглынае ўсе яе думкі.

У сцэне бал-маскарада ёсць выдатная мізансцэна, якая дапамагае раскрыць сэнс першага спаткання Джульеты і Рамэо.

Нас уразіў у гэтай сцэне праніклівы, натхнёны позірк Ждановіч, накіраваны на Рамэо. Мы ўбачылі ў гэтым позірку, якое нараджаецца ў яе душы пачуццё. Гэты позірк і доўгая паўза больш красамоўна, чым самыя ўзнёслыя словы, апавядалі аб непакоі сэрца Джульеты, у якім выспявае крыштальнай чыстаты каханне.

Мы не помнім такой змястоўнай бясслоўнай сцэны ў нашым тэатры, чым гэта, якая так выдатна праведзена І. Ждановіч і Платонавым. Пачынаючы з гэтай сцэны, мы ўбачылі Джульету Ждановіч больш сталай, чым Джульета Бабанавай. Разам з насычаным эмацыянальным малюнкам вобраза Джульеты, Ждановіч выяўляе думку, што каханне, якое так хутка нарадзілася ў яе душы, ужо з самага пачатку нясе зерне будучага трагічнага лёсу гэтага кахання. Артыстка дала нам магчымасць адчуць велічнасць кахання Джульеты і гатоўнасць гераіні афяраваць жыццём за свой ідэал.

Усё, што адбываецца «пасля бала» з Джульетай-Ждановіч, мае сваім вытокам эмацыянальны змест сцэны на бале. Пасля першага знаёмства з беларускай Джульетай у нас ужо больш не ўзнікалі непасрэдныя асацыяцыі з вобразам Бабанавай. Ждановіч прайшла праз увесь спектакль сваім уласным шляхам. Светлыя інтанацыі, якія ўласцівы Джульеце-Бабанавай, прагучалі прыглушана ў Ждановіч. Сумныя ноткі, якія з'явіліся ў голасе артысткі пры першай сустрэчы з Рамэо, больш ужо не пакідалі нашу Джульету.

Сцэна ў садзе Капулеці належыць да больш паэтычных у трагедыі. У гэтай сцэне ёсць усё, што можа вабіць закаханых: кветкі, паўднёвая зорная воч і месяц, «што срэбрам дрэвы паліває». Самыя шчырыя словы гаворыць тут Джульета свайму любаму: «Я задушыла-б пяшчотамі цябе».

Гэтая сцэна ночы—момант, калі дзяўчына Джульета паступова вырастае ў жанчыну,—праведзена Ждановіч з выключным майстэрствам. Калі-б не дачаснае згушчэнне трагічных адценняў у голасе артысткі, гэтая сцэна, магчыма, была-б найбольш блізкай аптымістычнаму духу Рэнесанса.

Лірычная задуменнасць спектакля, пра якую пісаў М. Марозаў («Советское искусство»), асабліва выразна праявілася, на нашу думку, у гэтай выдатнай сцэне.

Ждановіч не шкадуе трагічных фарбаў і ў далейшых сцэнах. Моцныя трагічныя інтанацыі мы адчулі ў маналогу і дыялагу Джульеты ў часе забойства Тыбальда, у сцэне ў Фра Лорэнцо, у яе ўзаемадачыненнях з нялюбым Парысам. З асаблівай сілай гэтыя інтанацыі прагучалі ў фінале трагедыі, які быў успрыняты як прысуд антычалавечнасці і гімн велічнаму і высокароднаму пачуццю. Вельмі шкада, што напышлівая працэдура «пахавання» Джульеты адцягвае ўвагу ад асноўнай тэмы — сцвярджэння перамогі шэкспіраўскага гуманістычнага ідэала, сцвярджэння ідэі «кахання, якое мацней за смерць». Барыс Пастэрнак — перакладчык «Рамэо і Джульеты» на рускую мову—быў захоплены «брэйгелеўскімі» фарбамі гэтага твору.

«Чароўнае стварэнне шэкспіраўскай зграбнасці—Джульета» (А. С. Пушкін), у сцэнічным увасабленні І. Ждановіч, лобач з «брэйгелеўскімі» фарбамі нясе ў вобразе і лірычную задуменнасць.

Ідучы сваім шляхам да шэкспіраўскага вобраза, І. Ждановіч сцвярджае ў ім і ўласную тэму, якую мы заўважылі ў яе Людміле («Позняе каханне») і цэлым шэрагу іншых вобразаў. Артыстка сцвердзіла ў Джульеце тэму перамогі дабра над злом, чалавечнасці над чалавеканенавісніцтвам, праўды над крыўдай, жыцця над смерцю.

Янка БРЫЛЬ

КАЗАЧОК

I

Самшэлы хутар Батракова Дзіч закінуты ў найбольш глухі куток Налібоцкай пушчы. Начамі дзікія свінні ўзрывалі бульбу пад самымі вокнамі хаты, а днямі, калі на хутар заходзіў чужы чалавек, Батрачышка Зіна хавалася ў каморку ці на печ.

Напачатку вайны над палянай гулі самалёты і чуўся, здаецца, зусім недалёкі грукат гармат. Аднак, салдатаў на хутары так і не бачылі: не йшлі сюдой ні нашы, адыходзячы, ні немцы.

Цяпер-жа, на першай зіме партызанскага царства, змянілася ўсё. Батрачыха ваявала з вясёлымі хлопцамі за кожны ахапак доўгага і жорсткага лясного сена, сама і мірылася з імі за чаркай, або смакуючы прывезены з дзесятай вёскі самасад. А Зіна настолькі прызвычаілася да чужых людзей, што неўзабаве прывяла дачушку. Нават хутар назвалі Карчмой, а старую—Карчмаркай.

Партызаны гасцявалі ў сваёй Карчме праездам, найбольш падрыўнікі, ідучы па «жалезку» ці ў лагер. Батрачыха пазнала іх за гэты час так шмат, што кожнага незнаёмага лічыла новым у пушчы, «свежанькім».

...Мішка Спорык, яшчэ двое і Валя прышлі да Карчмы на змяркані.

— Здарова, цётка, жывеш!—гукнуў яшчэ з сяней Кастусь.—А ў нас якая кветка, паглядзі! Свежанькая, цётка, казачок!...

Карчмарка амаль не зжахнулася.

— Ах мая!—дзяўчына ў портках! З вінтоўкаю! Ды што-ж гэта за свет настаў!..

А «свежанькая» — хоць-бы што, смяецца. Паставіла вінтоўку, села і глыбока, з палёгкай уздыхнула:

— Ой, каб яшчэ, здаецца, трошкі—не дайшла-б.

Ды такое-ж гэта з марозу румянае, жывае, спраўнае. Хлопец—ды годзе! Толькі як зняла кубанку і стала зачэсвацца—гэтыя пасмы дзявочыя, гэты грабеньчык... Ды як зняла рамень і вышываны кажушок—гэтыя грудзі дзявочыя...

І таму, як лажыліся спаць, старая Карчмарка шапнула:

— Ты, галубка, залазь пад сцяну, а я сама ад хаты лягу. Мая дурніца таксама калісь зухавала...

Ды «свежанькая» засмяялася ў адказ і лягла ад хаты сама.

II.

Аднак, як толькі згасла газніца, для «казачка» ізноў пачалася бяссонніца.

... Дык што-ж гэта, нарэшце, за бяда! Ці брыдзеш цэлы дзень па снезе, ці сядзіш за сталом—усюды адны толькі думкі, адно толькі казытанне пад сэрцам. І думкі новыя і сум нязведаны, салодкі. Ад самага рання чакаеш начной адзіноты, каб зноў захварэць на бяссонніцу, каб зноў бясконца марыць, марыць...

Марыць не так сабе, марыць аб ім, бо ён такі, нарэшце, ёсць.

«Ён» не з'яўляўся доўга. Спачатку на'т думкі аб ім не было. Калісь малая Валечка, прыбегшы з вуліцы, дзе верх заўсёды бралі хлопцы, з плачам пыталася ў мамы, чаму і яна не хлопец. Падлеткам білася з хлапцамі, ездзіла конна, на лыжах і часта марыла аб тым, з якім шчасцем абула-б калісь камандзірскія боты са шпорамі. Падабацца яна пачала досыць рана. Рана магло-б і каханне пачацца, ды Валя нікога з знаёмых хлапцоў не любіла і таму, калі бывала з хлопцам сам-на-сам, зусім не хвалявалася. Так і расла, быццам дзічка. Сама касіла, арала і па-хвацку віталася моцнай, шурпатай рукой. І ўсюды як быццам хацела давесці мужчынам, што ўсё на свеце можа зрабіць і яна. Быць толькі сувязной надакучыла вельмі хутка. Прыйшла ў атрад сама, супроць волі камісара. На кухню працаваць не пайшла, у медсёстры—таксама, засталася сапраўдным байцом. Спачатку ў мужчынскай зямлянцы было дзікавата. Пасля-ж аднаму з малайцоў, што быў занадта ўпэўнены ў сваёй прывабнасці, дзеля прыкладу хропнула ручкай нагана пад бараду. І тады вось з'явіўся «ён».

Гэта быў Мішка Спорык, камандзір падрыўнога ўзвода. Ён быў у атрадзе ўвесь час, дый так яна ведала яго, да прыходу ў атрад. Аднак, для Валі ён з'явіўся толькі тады, калі першы сярод насмешліва-лёгкіх адносін да яе хлапцоў назваў яе, як роўную, таварышам.

«Так і трэба,—казаў ён,—цяпер, малец, аблізвайся. А мала будзе—я дадам. Я за таварыша стану заўсёды!».

На гэтым пачалося. Спачатку была толькі прыязнь, а потым былі два выпадкі.

У першым выпадку, калі іхняя група наткнулася ноччу на засаду і з васьмі партызан толькі трох, разам з ёй, засталіся жывымі, Валя да болю спужалася смерці. Быццам толькі цяпер зразумела, што ёй восемнаццаты год, што гэта магчыма і з ёю. Другім разам яна толькі ўзяла на рукі дзіцянё, і зноў да болю адчула прагненне жыцця і жыцця... не адной.

З таго дня пачаліся бяссонныя ночы, раздвоенасць: адна Валя, ранейшая, баялася застацца з Мішам сам-на-сам так-жа вольна, як было дагэтуль; другая Валя, новая, з усёй сілай захаванага пачуцця марыла.

Яна законна чакала,—то нясмела, то ўпэўнена,—што Мішка нарэшце пачне, скажа ёй тое, што яна ўжо мо' тысячны раз (ды дзе там тысячны!) кажа яму ўсёй душой, так, як трэба дзяўчыне спачатку, без слоў. І ў гэтым чаканні бясконца мяняліся вобразы будучага шчасця.

А Мішка, як быццам, не думаў аб гэтым. Вось і цяпер ён спакойна спіць, у той час, як яна прыціскае рукі да гарачых грудзей, быццам жадаючы гэтым не выпусціць беднае сэрца. Трымае яго і бязгучна, амаль непрытомна шэпча:

— Што-ж, мне хіба самой падыйсці да цябе і сказаць: «Няўжо ты думаеш, мілы, што я і праўда «казачок», што я і праўда дзікая? Ды гэта-ж толькі для іншых такая, таму, што я ўсё шукала цябе. Няўжо ты не ведаеш, Міша, чаму я сама перайшла ў тваю групу? Няўжо ты думаеш, толькі таму, што зайздросціла вам у вашай слаўнай працы?.. Эх, ты...

...Ты чакаеш, пакуль можа я...

Ды раптам спужалася гэтае думкі, у цемры прыціснула рукі да шчок, заплюшчыла вочы і ўткнулася тварам у падушку.

— Ты што, ці не хворая дзеўка, чаго ты?—азвалася з цемры Карчмарка.

«Свежанькая» спачатку ціха, спалохана ахнула, а потым шэптам папрасіла:

— А ты мяне, цётка, і праўда пусці пад сцяну.

III.

Ізноў яны ідуць. Брыдуць па рыхлай дарозе, паміж нядошлага зарасніку, палянамі паўз шэрых будынкаў хутароў, па балоце, пакрытым хмызняком. Спераду едзе хурманка. На ёй вінтоўкі, гранаты, тол. Дзядзька кленчыць на санях і нудна, як гэты пануры адлежны дзень, маўчыць. Кабылка пляцецца абы-абы, а потым, калі яе б'юць вяраўчанымі лейцамі па сухім кантовым крыжы, трухціць і спатыкаецца, чапляючы падковай за падкову.

Мішка расказвае нешта, а хлопцы смяюцца. Ды Валя, бадай, не чуе яго. Яна і не слухае. Успамінаючы ноч з гэтым дзіўным сваім забыццём, яна нават рада, што ідзе зусім ззаду, і Мішка не бачыць яе. Да яе то вяртаецца зноўку настрой гэтых дзён—шчаслівае чаканне адзіноты, то сорам за тое, што ўчора раскісла.

«Ты не падумай толькі, што буду сама набівацца»—думае Валя.

— Дзвіна, брат, не тое, што Нёман,—расказвае Мішка.—Яна разліецца—мора! Ха-ха-ха! Успомнілася, хлопцы, ірундовіна. Крыгі ідуць па Дзвіне—проста жах, а на крызе сядзіць, брат, чырвоны певень. Тут смерць на носе, а ён—кукарэку!..

«Табе, голубе, бачыш, нічога, смяешся, а я...»—ізноў думае Валя.

— Пасмяяўся я з пеўня, а потым аднойчы і сам...— гаворыць Міша.

Ды раптам спыняецца ўсё. Перш чуваць з боку, зусім недалёка ад дарогі, дзе хутар на ўзгорку, мяшаны вокліч: «гальт!» і «стой!». Потым адтуль устаюць тры варожыя постаці: немец і два паліцаі...

І тады надыходзіць адзін з тых страшна кароткіх і страшна насычаных момантаў, аб якіх можна шмат гаварыць і амаль заўсёды недакладна.

Дзядзька са зброяй ад'ехаў наперад настолькі далёка, што ворагам значна бліжэй да яго. Зброя на санях, на шчасце, прыкрыта кажухом. Дзядзька, як быццам азораны, бяжыць да немца і задыхана, часта гукае: «Свой, свой, мы з Лужы, паночак, дальбог!» Паліцаі спакойна, упэўнена брыдуць па снезе амаль па калені і на'т вінтовак сваіх не трымаюць напагатове. Немец, трошкі збоку і ззаду, цяжка брыдзе да дзядзькі. Насустрач паліцаям стаіць адзін Міша. Рука ў кішэні кажушка, збялеў, толькі поздрамі паварушвае, быццам гатовы да скоку. Адзін паліцай адлучаецца, ідзе на яго, а другі—на Валодзьку. Паліцай нешта кажа і лаецца, быццам гатовы заехаць прахожаму поўху. Калі-ж ён падыходзіць зусім, Мішка пытаецца, проста ў вочы:

— А ты можа і ўдарыць хочаш, сукін сын?

Паліцай перш бармоча, збялеўшы: «Ды што вы, таварыш, завошта», а потым адскаквае ўбок і хапаецца за рукаятку затвора. Тады Мішка імгненна выхоплівае з кішэні наган. Страляе. Паліцай, узняўшы рукі, садзіцца. За гэтым стрэлам, як водгук, грыміць поўнагучны вінтовачны стрэл: замест Валодзькі другі паліцай б'е па Мішы. Мішка, здалося, хіснуўся, а потым страляе зноў, раз і другі раз. Другі паліцай перш асядае на снег, а потым лажыцца. Немец строчыць з аўтамата па доўгім, зашмальцаваным кажусе дзядзькі і ўцякае. Мішка першы бяжыць да кабылкі, якая рада, што больш не сцёбаюць лейцамі, стаіць на дарозе. Мішка бяжыць неяк дзіўна, нялёгка, задыханы. Ён цяжка падае на сані і крычыць: «гані!» Валя падае ззаду, якраз на яго і нешта крычыць таксама. Ды толькі Кастусь і Валодзька, дабегшы, паднімаюць кабылку на нейкі нядошлы галоп.

Страшны момант канчаецца тым, што па іх, як толькі немец узбег на ўзгорак, шалёна лапоча станкач...

Валя не чуе, як блізка спяваюць кулі. Яна толькі чуе яго і шчасліва, нарэшце, шчасліва шэпча:

— Я не дам цябе больш, затулю...

На гэтым канчаецца ўсё.

IV.

Ізноў у лясную дзіч ад старожкі пляцецца худая кабылка. Цяпер ужо не дзядзька, а Кастусь панура кленчыць спераду. На саломе пад доўгім кажухом ляжаць дзве бязмоўныя постаці. Чацверты таварыш, Валодзька, забіты.

За нізка навіслыя лапы ялін раз-заразам чапляе крывая вішнёвая дужка, і снег казытліва цярушыць на бледны твар казачка. Вочы з чорнымі, доўгімі вейкамі зачынены, аднак, пад імі... жыве адчуванне жыцця. Яна чуе чароўную музыку старых палазоў і адчувае снег, быццам нейчы гуллівы, кахаючы дотык. Пасля яна нават расплюшчвае вочы і патроху з цяжкасцю пазнае, што шэра-зялёная сетка над ёю—гэта ельнік і неба.

І тады пачынаецца шчасце, ізноў.

— Валя, мілая, тпру!—крычыць Кастусь і рэзка спыняе кабылку.

На Валю шугае туманам, а потым побач з ёй бясконца родны голас кажа:

— Лепш табе, Валя. Ну, дзякуй. Пашанцавала нам з табой: табе рука, мне—нага... Ды нічога.

Яна хацела-б нешта сказаць, але толькі крывіць у перамешку з болем вусны, усміхаецца і, заплюшчыўшы вочы, чуе, нарэшце, яго пацалунак. Мусіць, першы, бо вельмі-ж гарачы, куды лепшы як той, аб якім яна марыла.

5 мая 1946 г.

Сваёй перамогі вялікае свята!

* * *

ПАЭТ НА ФРОНЦЕ

(З рэдактарскага блакнота).

Ліпень 1941 года. Пасля жорсткіх баёў войскі нашай арміі адыйшлі ў раён Старая Руса. Штаб арміі асталяваўся недалёка ад перадавых пазіцый у маляўнічым лесе, паблізу вёскі Меднікава. Тут-жа размясцілася і рэдакцыя армейскай газеты «Сцяг Совецтаў».

Пасля жорсткай бамбардыроўкі, калі супрацоўнікі рэдакцыі толькі-што пакінулі шчыліны, да мяне ў шалаш прыйшоў чалавек, ніжэй сярэдняга росту, апрануты ў форму совецкага камандзіра.

— Ці я магу бачыць адказнага рэдактара?—запытаўся ён.

— Я—рэдактар.

— Добры дзень! Я—Аркадзь Куляшоў.

Па выпраўцы я адразу здагадаўся, што Аркадзь Куляшоў у арміі нядаўна: гімнасцёрка спераду была ўся ў складках; пілотка надзета няправільна.

Куляшоў расказаў, што ён нядаўна прыбыў з групай палітработнікаў і накіраваны ў рэдакцыю аддзелам кадраў для скарыстання на рабоце.

У тоне размовы Куляшова было штосьці такое, што адразу вабіла да сябе.

На развітанне я падаў яму руку і сказаў, што ён залічаны ў штат рэдакцыі ў якасці супрацоўніка.

Баі з кожным днём рабіліся ўсё больш жорсткімі. Немцы, несучы вялікія страты, у жніўні авалодалі Старай Русай. У гэтыя цяжкія для Радзімы дні, Куляшоў праз газету звяртаецца да воінаў:

Силу удара и ярость умножь,
Бей беспощадно врага, молодежь!
Коммунист, комсомолец! Будь первым
в бою за Родину свою.

Прыгадваецца такі выпадак. Група супрацоўнікаў рэдакцыі вярнулася з перадавых пазіцый. Яны расказалі пра геройскі подзвіг аднаго мінамётчыка, які, застаўшыся адзін з усяго разліку, сам падносіў міны, накіроўваў мінамёт на цэль, заражаў і страляў. Гітлераўцы абкружылі смелага воіна. Калі герой убачыў, што засталася толькі адна міна, ён схапіў яе і кінуў сабе пад ногі. Загінуўшы сам, ён знішчыў некалькі фашыстаў. Ніхто не ведаў, як звалі мінамётчыка. Апавяданне зрабіла на Куляшова вялікае ўражанне. Праз дзень на старонках газеты была надрукавана «Песня пра безымяннага героя», у якой апавядалася пра подзвіг адважнага воіна. Песня карысталася вялікім поспехам сярод армейцаў. Яе спявалі на матыў вядомай песні «Партызан Жалязняк».

Шмат вершаў Куляшоў прысвяціў героям, якія на полі бою ўславілі свае імёны—разведчыку Розаву («Разведчык»), лётчыку Бярэзіну («Чайка»), старэйшаму сяржанту Сапсаю («Помста»).

Асабліва ўсхваляваў воінаў верш Куляшова «Ліст з палону».

Патрэбна было ісці ў наступленне, каб адваяваць у ворага важны рубеж. Апошнія хвіліны падрыхтоўкі. Гарматы нацэлены на варожыя ўмацаванні. Каля кулямётаў у баявой гатоўнасці заляглі разлікі, напагатове мінамётчыкі, сапёры робяць праходы ў мінных палёх. Непадалёку ад пярэдняга краю ў лесе размясціліся рэзервы ў чаканні сігналу да наступлення. У гэты час падыходзіць намеснік камандзіра палка і зварочваецца да байцоў:

— Таварышы, перад боем мне хочацца прачытаць адзін верш. Няхай праўдзівыя яго словы яшчэ раз напомняць вам пра тыя пакуты, якія церпяць нашы людзі ў фашысцкай няволі. Няхай верш яшчэ раз напомніць вам пра ваш абавязак перад совецкім народам.

Афіцэр прачытаў «Ліст з палону». Кожнае слова глыбока западала ў сэрца воіна, выклікала нянавісць, натхняла на подзвіг, клікала да бязлітаснай адплаты ворагу. І калі прагучэлі апошнія словы верша—

Ліст ад сэрца ўсяго
Паланёная склала дзяўчына,
Ты чытай і адказ на яго
На штыку данясі да Берліна.—

байцы нецярпліва запыталіся, ці хутка будзе сігнал да наступлення.

Магутныя ўмацаванні немцаў былі знішчаны, задача была выканана паспяхова.

Надыйшла позняя восень. Рэдакцыя пераехала з лесу ў вёску Кувізіна. Да гэтага часу імя паэта ўжо карысталася шырокай вядомасцю сярод воінаў. Але асабліва любілі і паважалі Куляшова тыя, хто ведаў яго асабіста, як сціплага, акуратнага, простага і ініцыятыўнага таварыша.

Вядомасць Куляшова расла з дня на дзень. Ён атрымліваў шмат лістоў, у якіх чытачы дзякавалі яго за вершы.

Неяк раз у супрацоўнікаў рэдакцыі ўзнікла ідэя зрабіць у газеце гумарыстычны раздзел. Было выказана шмат пажаданняў, але ўсе згадзіліся з прапановай Аркадзя Куляшова асвятляць у газеце подзвігі воіна, імя якога павінна быць выдуманым. Паэт з запалам узяўся за ажыццяўленне гэтай ідэі. Ён сам прыдумаў загаловак і імя героя: «Рассказ о том, как бьет врагов на фронте Алексей Петров».

Першы вершаваны фельетон з'явіўся ў газеце 9 верасня 1941 года. Становішча тады было цяжкім. Нямецкая танкавая калона прарвалася з раёна Дземянска і заняла раённы цэнтр Лычкава, напалову абкружыўшы нашу армію. Але ўсё-ж газета трапіла на перадавыя пазіцыі і водгукі аб «Аляксею», якія прывезлі супрацоўнікі рэдакцыі, былі самымі ўдзячнымі. Байцы ўбачылі ў Пятрове адважнага воіна, майстра сваёй справы, і прасілі рэдакцыю хутчэй паведаміць пра лёс героя.

Такіх вершаваных фельетонаў было змешчана ў газеце каля 80. Больш паловы з іх належаць пяру Аркадзя Аляксандравіча. Калі воін праслаўляўся ў баю, яму гаварылі: «Малайчына! Дзейнічаў, як Пятроў». У любым падраздзяленні можна было пачуць прымаўку Пятрова: «Справу трэба разумець». Воіны вельмі непакоіліся за лёс Пятрова. Лейтэнант Андросаў пісаў у рэдакцыю:

«Дарагі таварыш рэдактар! Нас, байцоў і афіцэраў падраздзялення, вельмі хвалюе лёс Аляксея Пятрова. Відаць, ён трапіў у бяду. Як бачна са змешчанага ў газеце матэрыялу, мейсца бою вельмі нагадвае наш участак фронта. Байцы просяць паслаць іх на выратаванне Пятрова. Будзьце ласкавы, паведаміце дакладна мейсца, дзе прапаў Аляксей Пятроў, і мы пойдзем да яго на дапамогу».

Яшчэ больш цікавы выпадак здарыўся з армейскім Ваенторгам. Напярэдадні новага 1942 года прыйшоў работнік Ваенторга і заявіў: «Мяне прыслаў начальнік Ваенторга з просьбай даведацца пра адрас Аляксея Пятрова. Мы хочам паслаць яму пасылку на Новы год. Гэта-ж будзе злачынствам, калі мы на Новы год ды не пачастуем шакаладам і віном такога героя».

І як-жа ён здзівіўся, калі даведаўся, што байца Аляксея Пятрова не існуе, а імя яго выдуманае.

Незвычайны поспех меў нумар нашай газеты, у якім была надрукавана народныя на фашысцкую газету. Гэты раздзел газеты мы назвалі «Вралішэр Тарабахтэр». Наша газета дасціпна кпіла над намаганнямі фашысцкага друку сказіць сапраўднае становішча рэчаў на фронце.

Часта можна было бачыць на перадавых пазіцыях — у зямлянках і бліндажах вітрыны з выразкамі з гэтай газеты.

Аркадзя Куляшова даўно непакоіла думка аб напісанні вялікай паэмы пра першыя дні Айчыннай вайны.

Улетку 1942 года Аркадзь Аляксандравіч быў выкліканы на франтавую нараду рэдактараў і пісьменнікаў. Праз некалькі дзён Куляшоў падзяліўся думкай аб напісанні паэмы. Па-ранейшаму, актыўна ўдзельнічаючы ў гумарыстычным аддзеле газеты, ён пачаў працу над паэмай.

Працаваў ён шмат, з захапленнем. Ні варожыя бамбардыроўкі, ні бесперапынны гул артылерыі не маглі перашкодзіць паэту ў яго працы.

Бывала, зойдзеш апоўначы да яго ў зямлянку. Усе спяць. Адзін Аркадзь ляжыць задуменны на тапчане. Раптам ён пераварачваецца са спіны на жывот, бярэ сшытак і хутка запісвае некалькі строф, затым зноў кладзецца дагары і абдумвае наступную страфу.

—Не магу спаць,—гаварыў ён. — Пакуль не закончу — не супакоюся. Вельмі ўжо мяне захапіла гэтая тэма.

Так на працягу трох месяцаў была створана ў франтавых абставінах выдатнейшая паэма — «Сцяг брыгады».

Аркадзь Куляшоў прайшоў у гады вайны суровы шлях воіна.

Падпалкоўнік В. ФАРБЕРАЎ,
былы рэдактар газеты «Сцяг Совецтаў».

*

ТАНК

Адзін на даўнім полі бітваў,
Як помнік ярасных атак,
Стаіць, снарадамі прабіты,
Нямецкі абгарэлы танк.
Да нас ён на сканання трапіў...
І з таго часу дзень пры дні
Іржа свае рудыя лапы
Кладзе шырока на брані.
У подыху вясновым, свежым
Туман радзее па равах,
І на пакрытай пылам вежы
Узрастае кволая трава.
Яе вятры стэпоў кранаюць
Крылом ласкавым і тугім,
Калі праз шчыліны іграюць
Свой шматгалосы мірны гімн.
І здэцца, гледзячы здалёку,
У промнях ранішняй зары
Агнём, як зарава высокім,
Бы ў час сканання, ён гарыць.
Тады ў спакоі дрэмле поле,
Блішчыць у росах сенажаць,
Бо траў зялёных больш ніколі
Чужому танку не таптаць.

Алесь БАЧЫЛА.

НАРОДЗІНЫ

У суседа майго па кватэры
Была радасць вялікая ў Дзень Перамогі:
Урачыстасць не знае ніякае меры,—
Калі доўга чакаеш да болю, да змогі.
Рэдка дні выдаюцца такія:
Святкавалі народзіны ў памятны ранак,
Мелі клопатаў шмат маладыя—
Стрэць жаданых гасцей і правесці на ганак.
Калі выпала шчасная доля —
У хвілі нашага свята дачцы нарадзіцца,
Парашылі ў згодзе супольнай
Даць імя ёй славутае, пекнае — Вікця.
Покуль Вікця ляжыць у пялёнках
І хапае паветра малымі рукамі,
Ёй не знаць, як прыгожа і звонка
Гучыць слова «Вікторыя» сёння між намі.
Пройдуць многія, многія годы...
Можа свет назаўжды мірным волатам стане,
Можа ветру ўсходняга подых
Не стрымаюць ні горы ні на'т акіяны.
Вікця будзе дарослай дзяўчынай,
І калі хто пра час нараджэння спытае,
Скажа з гонарам словам адзіным...
Аб астатнім-жа кожны і сам прыгадае.

Алесь АСТАПЕНКА.

В. Цвірка.

Пейзаж.
Фота Г. Бугаенкі

* * *



Калона работнікаў мастацтва. Першамайская дэманстрацыя ў Мінску.

Пісьменнікі абмяркоўваюць пяцігадовы план

Днямі адбыўся сход партыйнай арганізацыі Саюза Совецкіх пісьменнікаў Беларусі, прысвечаны абмеркаванню Закона аб пяцігадовым плане аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі нашай краіны. З дакладам аб задачах пісьменнікаў у сувязі з пяцігадовым планам выступіў паэт Пятрусь Броўка. Ён адзначыў, што Сталінскі план развіцця народнай гаспадаркі — гэта гістарычны дакумент, які раскрывае перад нашым народам вялікія магчымасці далейшага развіцця прамысловасці, сельскай гаспадаркі, транспарта, навукі і культуры. За пяць гадоў Беларусь не толькі дасягне дваеннага ўзроўню развіцця, але і значна яго перавысіць. Выкананне пяцігадовага плана патрабуе вялікага напружання сіл усяго нашага народа.

Пасля даклада П. Броўкі разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі.

—У пяцігадовым плане ,— гаворыць Кандрат Крапіва,—не запісана, колькі раманаў, ці паэм мы павінны напісаць. Але гэта не значыць, што нам не трэба планаваць сваю работу. Для стварэння капітальных твораў аб Айчыннай вайне і партызанскай барацьбе нашага народа спатрэбіцца многія гады сур'ёзнай работы. Яе трэба разумна спланаваць, разумна расставіць пісьменніцкія сілы.

Партыя і Ўрад патрабуюць ад нас твораў, вартых Сталінскай эпохі, твораў, якія-б прапагандавалі пяцігадовы план і паказалі герояў аднаўлення нашай гаспадаркі. Пісьменнікі павінны часцей бываць на будоўлях, у калгасах, ведаць перадавікоў працы і ствараць іх партрэты.

У сваім выступленні Міхась Клімковіч спыніўся на рабоце з маладымі пісьменнікамі.

—Да нас у Выдавецтва,—зазначае ён,—прыходзяць цэлыя сшыткі вершаў і апавяданняў. Яны гавораць аб тым, што кадры ў нас ёсць. З імі толькі трэба працаваць.

Дом Народнай творчасці правёў рад рэспубліканскіх нарад сваіх кадраў. Выходзіць, што сабраць людзей можна. Нам нельга спасылацца на аб'ектыўныя прычыны і гэтым апраўдваць сваю бяздзейнасць у рабоце з маладымі.

Мы ведаем нямала таварышоў, якія на працягу Айчыннай вайны пісалі нядрэнныя нарысы. Іх можна цяпер уключыць у работу па прапагандзе пяцігадовага плана, па напісанню нарысаў аб героях аднаўлення краіны. Нядрэнна было-б стварыць пры Саюзе совецкіх пісьменнікаў секцыю нарыса, якая-б узначаліла ўсю гэту работу.

Затым на партыйным сходзе выступіў Ілья Гурскі. Ён адзначыў, што ў апошні час у літаратараў адчуваецца творчая заспакоенасць. Ні адна секцыя Саюза совецкіх пісьменнікаў не працуе.

Трэба, каб партыйная арганізацыя больш сур'ёзна займалася творчай работай пісьменнікаў.

Партыйны сход прыняў рашэнне па дакладу П. Броўкі аб пяцігадовым плане і задачах пісьменнікаў.

Янка МАЎР

НА ПАРОЗЕ БУДУЧЫНІ

Цягнік ішоў з усходу, на Маскву. Ішоў па землях, якія не бачылі ворага з часоў Батыя. Але подых новага Батыя, з захаду, адчуваўся і тут. Адчуваўся на палях, якія і радзілі не так і не смяяліся; у вёсках, прыціхлых і суровых, якія думалі сваю думу; на станцыях, беднаватых і няўтульных; відаць быў у вачах вось гэтай старой маладзіцы, у рухах гэтых старых рабочых. І надвор'е нейкае няпэўнае—ні то вясна, ні то восень.

Як светлыя праменні, хадзілі па краіне радасныя словы: «Немцаў абкружылі... разграмілі... узялі...» Але да ўсяго можна прызвычаіцца—прызвычаіліся і да гэтых слоў. Два гады ўжо б'ем іх, а яны ўсё яшчэ дыхаюць, усё яшчэ шкодзяць. Можа яшчэ два гады прыдзецца іх біць, абкружаць, знішчаць?..

Адно толькі ясна: за лёс радзімы трывожыцца ўжо не прыходзіцца, застаецца толькі ў кожнага свая асабістая трывога—за сына, за бацьку. І асабліва балюча думаць, што яны могуць загінуць перад самым канцом вайны.

Спакойна, але цяжка дыхала руская зямля, як той падарожны, што прайшоў вялікі і небяспечны шлях і набліжаецца да свайго дому. Ён рады, што дарога канчаецца, але стаміўся і весяліцца зусім не мае ахвоты.

І цягнік ішоў, як той самы падарожны, цяжка, упарта, глуха пастукваючы сваімі коламі і сурова пакрываючы па ваколіцы.

У купэ мяккага вагона—маўклівы падпалкоўнік, заклапочаны маёр з рэдакцыі франтавой газеты, маладзенькі артылерыйскі лейтэнант і таксама малады, худы капітан.

Ці яны ўжо ўсё перагаварылі, ці кампанія такая негаваркая падабралася, але гутаркі ў купэ было мала. А калі перакідваліся якімі словамі, дык меней за ўсё пра вайну. Ды вядома ўжо, што ў такіх выпадках больш за ўсё любіць гаварыць пра вайну народ цывільны.

Толькі артылерыйскі лейтэнант усё стараўся павярнуць гутарку на ваенную тэму, бо першы раз ехаў на фронт. Падпалкоўнік і маёр вярталіся на фронт са шпіталю, а капітан зусім ехаў дадому. Гледзячы на яго акуратную падцягнутую фігуру, ніхто не сказаў-бы, што гэта інвалід першай групы: левая нага ў яго была не свая.

Лейтэнант светлымі, пукатымі дзіцячымі вачыма ўсё дапытваўся аб рэкаторых, як ён казаў, «неафіцыйных» умовах франтавога жыцця, але яму часцей за ўсё з усмешкай адказвалі: «Убачыце самі».

— Баюся, што не паспею,—сказаў ён з наіўным сумам.—Берлін ужо ўзялі.

Маёр пастараўся яго суцешыць:

— Войск у яго яшчэ нямала. Пакіне супроць саюзнікаў якую тысячу салдат, а з рэшткай можа ваяваць з намі хоць тыдзень, а за гэты час вы і даедзеце.

— Так, вайна канчаецца,—задумліва сказаў капітан,—але ўявіць сабе гэты канец аніяк не магу.

У гэты момант з суседняга купэ пачуўся зычны голас:

— Усё магу сабе ўявіць, хоць вайну з марсіянамі, а канца вайны ўявіць сабе не магу. Як мы будзем жыць без паведамленняў ад совецкага інформбюро? Як мы будзем адчуваць сябе, калі зваліцца з плеч цяжар? Які выгляд будзе мець Еўропа і міжнародныя адносіны?

— Чуеце?—усміхнуўся падпалкоўнік.—Відаць, усе мы думаем аднолькава.

З другога купэ, нібы выбухі мін, даносіўся стук даміно: там думалі, што лепш за ўсё не думаць пра такія высокія матэрыі.

... Капітан Віктар Смолін ніяк не мог заснуць. Чым бліжэй пад'язджаў ён да роднага дому, тым цяжэй рабілася яму на сэрцы. Яму-ж толькі дваццаць шэсць гадоў, а ён ужо поўны інвалід,—фактычна ён застаўся толькі з адной рукой. А калісьці ён быў найлепшым кіперам у сваёй завадской камандзе. І як яго сустрэне Рына?.. Яна пэўна вырасла, пасталела... Цяпер яна на яго і глядзець не захоча. Каму ён патрэбны такі?.. І для сваіх старых бацькоў ён прывядзе адно толькі гора. Не ён іх падтрымае на старасці, а ім трэба яго падтрымліваць. Вось усе чакаюць канца вайны, а што гэты канец дасць яму?..

На верхніх паліцах спалі маёр і лейтэнант. У калідоры нехта ціха казаў:

— Гэта-ж цуд нейкі: чым бліжэй да канца вайны, тым магутней робіцца наша армія. Такіх катастрафічных удараў, як нашы, яшчэ ніхто, нідзе, нікому і ніколі не наносіў.

Заварушыўся падпалкоўнік, сеў, запаліў папяросу. Відаць, і ў гэтага спакойнага чалавека ёсць свае згрызоты.

— Не спіцца, таварыш падпалкоўнік?—сказаў Смолін.

— Нешта не клеіцца,—адказаў той.

Раптам недзе далёка, у другім канцы вагона, пачуліся словы:

— Германія капітуліравала!

Падпалкоўнік і капітан усхапіліся, прыслухаліся.

Па вагону, нібы навальніца, каціўся гул:

— Канец вайне! Германія капітуліравала!

Адкуль узяліся гэтыя весткі? З поля, ці з лесу, што прабягалі міма акон? Як-бы там ні было, а хутка ўвесь вагон гудзеў, як устрывожаны вулей. Цягнік у гэты час праходзіў, не спыняючыся, ля нейкага захудалага раз'езда—і раптам з цемры некалькі галасоў так шчыра закрычалі «ура», што ў капітана аж мароз прабег па целе.

У вагоне ўжо ніхто не спаў. Усе твары свяціліся, кожны спяшаўся выказацца, не слухаючы другога.

Галовы самі падымаліся, грудзі самі выпроставаліся. Дзе ты пяпер, вораг подлы і люты? Вылізвай кроў сваю!

І зрабілі гэта мы. Ёсць ад чаго ўздымацца галовам, выпроставацца грудзям.

Артылерыйскі лейтэнант збянтэжана паўтараў:

— Вось і канец! Вось і канец!—і ніяк нельга было распазнаць, ці ён радуецца, ці шкадуе, што абышлося без яго.

У другім месцы ішла гарачая дыскусія на тэму: ці будзе гэтая вайна апошняй?

Некаторыя спакойна і ўпэўнена казалі:

— Пакуль існуе імперыялізм і капіталізм...

Другія супярэчылі:

— Хіба вы не бачыце, што ўвесь свет не жадае вайны?

Яшчэ некалькі хвілін назад падобныя і розныя іншыя пытанні стаялі, як вада перад плацінай, і толькі ціха варушыліся, а цяпер плаціна прарвалася—і ўсё ў адным напрамку, цяпер вырашалася зусім у другім. Усе бытавыя і сямейныя справы таксама павярнуліся другім бокам. Увесь свет павярнуўся другім бокам. І павярнулі яго мы!..

...Цягнік ішоў ад усходу, па тых землях, дзе не ступала нага ворага з часоў Батыя і ніколі не ступіць. Паравоз ляцеў лёгкай птушкай, колы мілагучна выстуквалі рытм. Палі смяяліся, лясы спявалі. Над калгасамі ўздымаліся песні, музыка і радасць. Старая бабулька на сцежцы, з клункам на спіне, не адставала ад цягніка: самі ногі неслі яе да дзеда, каб паведаміць, што хутка прыдуць іх сыны. Старыя рабочыя весела гушкалі ля моста вялізнае бервяно, нібы гуляючы з ім. Дзяўчаты махалі цягніку хусткамі і крычалі «ура», пастухі таксама крычалі «ура». Апрача таго, і ў лагчыне, нават не бачачы цягніка, нехта сам сабе крычаў «ура».

На станцыях ні то кірмаш, ні то ўрачыстая сустрэча цягніка. Выйшаў падпалкоўнік з вагона—і імгненна ўзляцеў у паветра. Маёра абхапіла за шыю прыгожая дзяўчына і стала цалаваць.

— Дзеля аднаго гэтага варта было ваяваць чатыры гады,—казаў маёр.

А на другой станцыі публіка абкружыла артылерыйскага лейтэнанта і давай качаць яго з крыкамі:

—Дзякуем вам, нашы родненькія!

Бедны лейтэнант, вярнуўшыся ў вагон, не мог глядзець у вочы сваім таварышам. Яму здавалася, што ўсе смяюцца з яго. Каб ведаў, што так будзе, нікому не сказаў-бы, што яшчэ не быў на фронце.

І ў купэ былі ўжо не тыя пасажыры: малады, гаваркі падпалкоўнік, вясёлы маёр, жыццерадасны капітан.

За гэтыя гадзіны ўсё мінулае адышло ў гісторыю, і наша краіна перастуціла парог будучага.

І ўбачыў капітан Смолін, што для яго гэтае будучае зусім не такое, як здавалася ўчора. Адкуль ён узяў, што яму і жыцця ўжо не будзе? З правай рукой, з добрай галавой ды з такім натхненнем, якое цяпер пануе навакол, можна зрабіць такое, чаго ў іншых умовах ніяк не зробіш. І адкуль ён узяў, што ён фізічна слабы, калі яму так і карціць ісці, рухацца, працаваць? А якое цяпер будзе цікавае жыццё наогул! Як хораша жыць і працаваць, працаваць і жыць!..

...Масква ззяла. Блакітныя вогненныя слупы шнырылі па небе. Жмені рознакаляровых зор ўзляталі ў паветра і дажджом падалі ўніз. Грымелі гарматы. Разлівалася музыка. Гулі галасы мільёнаў людзей—увесь народ быў на вуліцах. І ўсе смяяліся.

Ніводнага чужога не было сярод гэтых мільёнаў—усе звярталіся адзін да аднаго, як да блізкага знаёмага. Ніводнага непаразумення, ніводнага грубага слова. Вышэйшае шчасце, шчасце народнае, аб'ядная і зблізіла ўсіх.

У гэты дзень Масква, як і ўся Краіна, перастуціла парог будучага.

Смолін з насільшчыкам стаяў перад вакзалам, як на беразе мора. Як пераправіцца праз яго? Але доўга стаяць не давялося—падпаўзла машына, і адтуль пачуўся голас:

— Таварыш, вам куды? Сядайце!

У машыне была сям'я нейкага знанага чалавека. І Смолін адразу адчуў сябе ў гэтай незнаёмай сям'і, як у сваёй. Машына паехала «шагам». На радыятар узабраліся два хлапчукі—і ніхто ім не пярэчыў.

І калі Смолін сядзеў ужо ў сваёй роднай сям'і, то ні яму, ні яго бацькам, ні Рыне зусім не прыходзіла ў галаву, што ён інвалід. Бо яны перастуціле парог будучага.

Падпіска на новую пазыку

* * *

Пасля таго, як па радыё была перадана пастанова Совета Міністраў СССР аб выпуску Дзяржаўнай Пазыкі Аднаўлення і Развіцця нашай народнай гаспадаркі, адбыўся сход пісьменнікаў.

З дакладам аб новай дзяржаўнай пазыцы выступіў Алесь Стаховіч. Гаворачы пра вялікі размах работы ў чацвертай Сталінскай пяцігодцы, ён зазначыў:

— Няхай нашы сродкі ідуць на ўмацаванне краіны, на яе росквіт, на шчасце нашага народа.

Выступіўшы затым Міхась Лынькоў заклікаў пісьменнікаў сумленна выканаць свой грамадзянскі абавязак і аддаць свае зберажэнні ў пазыку краіне.

За першую гадзіну падпіскай былі ахоплены ўсе пісьменнікі. Народны паэт Якуб Колас падпісаўся на 30.000 рублёў, Міхась Лынькоў — на 18000 рублёў, Кандрат Крапіва — на 19000 рублёў, Пятро Глебка і Пятрусь Броўка — на 10000 рублёў кожны, Міхась Клімковіч — на 6000 рублёў, Янка Маўр і Алесь Стаховіч — на 5000 рублёў кожны, Валянцін Таўлай — на 4250 рублёў, Віталі Вольскі — на 3800 рублёў і Алесь Якімовіч — на 3600 рублёў.

* * *

Усе работнікі калектыва тэатра імя Якуба Коласа ахоплены падпіскай на Дзяржаўную Пазыку Аднаўлення і Развіцця народнай гаспадаркі СССР.

Лаўрэат Сталінскай прэміі народны артыст БССР А. Ільінскі падпісаўся на 250% свайго месячнага акладу.

На 200% месячнай зарплаты падпісаліся лаўрэаты Сталінскай прэміі народныя артысты Ц. Сяргейчык, П. Малчанаў і заслужаны дзеяч мастацтва Н. Лойтар, а таксама народны артыст БССР Звездачотаў і работнікі тэатра — Барысаў, Дорскі, Радзялоўская, Вялікі, Цырлін і інш.

Агульная сума падпіскі на пазыку склала 160% фонда заработнай платы.

* * *

126% агульнага фонда заработнай платы—такі вынік падпіскі на Дзяржаўную Пазыку Аднаўлення і Развіцця народнай гаспадаркі СССР у Беларускім Дзяржаўным тэатры оперы і балета.

З асобных падпісчыкаў вылучаюцца канцэртмайстра балета В. Байко-Русіян, якая падпісалася на 330% свайго месячнага аклада, Народная артыстка СССР і БССР Л. Александроўская і Заслужаны артыст БССР В. Лапін, якія падпісаліся на 250% свайго аклада. Народны артыст БССР І. Балоцін падпісаўся на 7000 рублёў і з іх 3000 унёс наяўнымі.

200% свайго месячнага заработку далі дзяржаве Народныя артысты БССР М. Дзянісаў, Р. Млодэк. А. Нікалаева, мастацкі кіраўнік тэатра А. Брон, заслужаная артыстка БССР С. Друкер, артыст аркестра А. Марголін і другія.

* * *

3-га мая ў тэатры імя Янкі Купалы адбыўся мітынг, прысвечаны выпуску Дзяржаўнай Пазыкі Аднаўлення і Развіцця народнай гаспадаркі СССР.

Мітынг адкрыў сакратар партарганізацыі тэатра заслужаны артыст БССР С. Бірыла. Ён гаварыў пра вялікае значэнне новай пазыкі ў аднаўленні і развіцці нашай краіны і заклікаў усіх работнікаў тэатра адзінадушнай падпіскай адказаць на пастанову Совета Міністраў СССР аб выпуску пазыкі.

С. Бірыла падпісаўся на 3000 руб., што склала 200% яго месячнага аклада.

На 200% месячнага акладу падпісаліся—заслужаны дзеяч мастацтва БССР Л. Літвінаў, народныя артысты БССР І. Ждановіч, В. Галіна, Л. Ржэцкая, заслужаныя артысты БССР У. Дзядзюшка, С. Станюта, Л. Шынко, мастак Б. Малкін і інш.

Вучні драматычнай студыі тэатра т. т. Кавалёва, Каплан, Рэнковіч, Лапідус, Чыжэўская, Вольскі, Бобча і Краўчанка падпісаліся на пазыку на 200% стыпендыі.

Агульная сума падпіскі склала 139% месячнай зарплаты калектыва тэатра.

Пісьменнікі Я. Маўр, М. Лынькоў, І. Гурскі і П. Глебка падпісваюцца на новую пазыку. Фото Г. Бугаенкі.

Першы тур Усесаюзнага конкурса артыстаў эстрады

Першы тур Усесаюзнага конкурса артыстаў эстрады праходзіць з 6-га па 10-е чэрвеня ў Мінску.

Для правядзення конкурса створаны арганізацыйны камітэт у складзе лаўрэатаў Сталінскай прэміі народнай артысткі СССР і БССР Л. Александроўскай і драматурга К. Крапівы, а таксама народнай артысткі БССР Л. Ржэцкай, заслужаных дзеячоў мастацтва БССР кампазітара Я. Цікоцкага і рэжысёра драматычнага тэатра імя Янкі Купалы Л. Літвінава, мастацкага кіраўніка Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета дырыжора А. Брона, кампазітара Д. Лукаса і інш.

БУРШТЫН

Музыка Д. Лукаса *Словы М. Танка*



Варажская страла
Ці меч сасну параніў, —
Як слёзы, паплыла
Смала з гарачай раны.
І водбліск быў у ёй
Балтыйскіх жоўтых дзюнаў,
Напоеных крывёй
Магутнага Пяруна.

Пранесліся вякі.
І на прыморскі рынак
Прынеслі рыбакі
Дзве пацеркі бурштыну.
Іх адкупіў матрос,
Аж з Добрае Надзеі,
І дзеўчыне занёс,
Што клікаў я Надзеяй.

І вось, перада мной,
Мінулых дзён жывіца,
У красуні маладой
Палае ў завушніцах.
І толькі я кляну,
У рыбачку закаханы,
Далёкую сасну
Над морам-акіянам.

„Руслан і Людміла“ ў канцэртным выкананні

Днямі ў Акруговым Доме афіцэраў у Мінску адбылася прэм'ера мантажа оперы М. І. Глінкі «Руслан і Людміла», які быў выкананы артыстамі Беларускага тэатра оперы і балета. Думку аб пастаноўцы оперы ў канцэртным выкананні можна лічыць мэтазгоднай, маючы на ўвазе выключна цяжкае сцэнічнае афармленне оперы-казкі і тую акалічнасць, што лібрэта оперы пазбаўлена сюжэтнага развіцця. У свой час, у напісанні тэкста для оперы прымалі ўдзел сем чалавек, дарэчы, некаторыя з аўтараў лібрэта мелі, наогул, выпадковыя адносіны да літаратуры. У выніку—атрымалася опера, пазбаўленая гострых драматычных калізій, сутычак і напружнасці дзеяння. Таму музычны крытык Сероў правільна назваў «Руслана і Людмілу» не операй, а араторыяй, музычнай формай без сцэнічнага дзеяння і афармлення, дзе музычнае апавяданне вядзецца хорам і спевакамі-салістамі.

Музыка Глінкі ў гэтай оперы ўяўляе выключную каштоўнасць з боку чыстаты і бездакорнасці майстэрства, а таксама з боку музычнай характарыстыкі асобных сцэнічных вобразаў. Опера на доўгі час засталася ўзорам класічнай дасканаласці для ўсёй рускай музыкі.

У пастаноўцы мантажа оперы перш за ўсё патрэбна адзначыць мастацкага кіраўніка тэатра, галоўнага дырыжора А. Брона. З вялікім майстэрствам і тактам А. Брон раскрыў мастацкае багацце партытуры вялікага кампазітара. У яго дырыжорскай трактоўцы бліскуча прагучала ўверцюра оперы, пабудаваная на асноўных музычных тэмах, а таксама і ўся наступная музыка мантажа.

Галоўны хормайстра тэатра Г. Пятроў выдатна справіўся з падрыхтоўкай хораў оперы—«Лель таямнічы», «Кладзецца ў полі змрок начны» і др. За параўнальна кароткі тэрмін сваёй работы ў тэатры Г. Пятроў добра настроіў хор, ураўнаважыўшы гучанне харавых партый, з добрай нюансіроўкай і дыкцыяй. Гэтыя дасягненні патрэбна таксама адзначыць у нядаўна пастаўленай оперы «Русалка», дзе хор гучаў з гранічнай чыстатой.

Народная артыстка БССР Л. Аляксеева з вялікім майстэрствам выканала партыю Людмілы. Партыю Ратміра («І гарачыня і спёка») глыбока змястоўна выканала артыстка В. Валчанецкая. Добра выканаў партыю баяна (адно з выдатнейшых эпічных мейсц оперы) малады артыст тэатра І. Картавенка.

Астатнія выканаўцы—засл. арт. БССР І. Мурамцаў (Руслан), артыст А. Бялоў (Светазар), засл. арт. У. Таланкін (Фарлаф) выконвалі свае партыі на патрэбным мастацкім узроўні.

Шкада толькі, што ў мантажы не былі выкананы такая выдатная партыя, як арыя Гарыславы («Кахання цудоўная зорка») і хоры: «Ах, ты свет, Людміла» і «Не прачнецца птушка раніцой».

Трэба адзначыць таксама, што сцэна, прыстасаваная для камернага выканання, была не зусім добра афармлена. Партрэты Глінкі і Пушкіна маюць недастатковае падабенства, акрамя таго, яны дрэнна акаймаваны. Неабходна, каб старажытна-рускі арнамент быў на сценах і заднім плане сцэны.

І усё-ж публіка, што прысутнічала на канцэрце, цёпла прыняла ўсіх выканаўцаў. Добра было-б часцей ставіць гэты, у асноўным, удала складзены мантаж.

Р. ПУКСТ

Вечар сімфанічнай музыкі

Сімфанічны канцэрт Беларускай Дзяржаўнай Філармоніі пад кіраўніцтвам дырыжора Тацяны Каламійцавай, які адбыўся гэтымі днямі, быў пабудаваны па цікавай і складанай праграме. Першае аддзяленне было прысвечана творчасці сучаснага беларускага кампазітара Рыгора Пукста, другое—Вердзі і Вагнеру.

Канцэрт пачаўся з выканання другой сімфоніі Пукста.

Напісаная ў стылі рускай сімфанічнай школы (маскоўскай), музыка сімфоніі прасякнута інтанацыямі беларускага фальклора. У першай частцы матэрыялам для адной з тэм служыць беларуская народная песня «Ой, зарадзілі», другая песня «Кума мая, кумачка» распрацавана ў фінале. Але элементарнае запазычанне народных песень і перанясенне іх у сваю партытуру не з'яўляецца характэрным для творчага метада Пукста. Інтанацыі народнай музыкі, па сутнасці, складаюць аснову ўсёй мовы сімфоніі, але не ў простым запазычанні, а ў выглядзе перапрацаванага і створанага нанова арыгінальнага матэрыялу. У мінулым такі творчы метад быў характэрным для класікаў рускага сімфанізма — Чайкоўскага, Барадзіна, Глінкі, а ў наш час—для Асаф'ева і Шапорына. Сімфонія Пукста складаецца з чатырох частак, аб'еднаных (на ўзор 4-й і 5-й сімфоній Чайкоўскага) адной агульнай музычнай тэмай скрабінскага складу.

Усхваляваная і напружаная першая частка, якая сімвалізуе сутычку і барацьбу асноўных тэзісаў, пабудавана на рэзкіх кантрастных эпізодах. Аднак, пры выкананні не ўсё ў ёй гучала добра: не была яшчэ знойдзена дастатковая роўнавага ў размеркаванні энергіі, часамі здавалася, што некаторыя эпізоды, асабліва плаўнага лірычнага характару, нібы тармозяць развіццё і паслабляюць той выдатна схоплены напружаны тонус сімфоніі, які ўзнікае ад гучання першаідэі. Відавочна, гэта ідзе ад вельмі дрэннай акустыкі сцэны Мінскага Дома афіцэраў. Аўтара абвінаваціць у гэтым нельга, бо меладычны бок яго творчасці, мяккая лірыка, спакойныя, светлыя гучанні складаюць адну з галоўных і яркіх асаблівасцей яго таленту. Другая частка сімфоніі прагучала добра. Але лепш за ўсё ўдалося і дырыжору і аркестру выкананне трэцяй часткі сімфоніі—скерцо.

Гэтая частка, напісаная ў хуткім складаным рытме, уяўляе сабой незвычайную ігру гукаў. Цяжкая для аркестра, яна прагучала як выдатны віртуозны фрагмент, які ўспрыймаецца з цікавасцю. Чацвертая частка сімфоніі была выканана добра, але некалькі фармальна і сухавата. Увогуле пры выкананні гэтай сімфоніі быў правільна вызначаны характар трактоўкі яе, як аптымістычнага твору, без залішняга надрыву і нервознасці, твору, які адлюстроўвае ў сабе светапогляд аўтара і яго рэалістычнае ўспрыйманне жыццёвых з'яў.

Дзве арыі Машэкі з оперы той-жа назвы Рыгора Пукста на поўгістарычны, поўлегендарны сюжэт, які ўзяты з вядомай паэмы Янкі Купалы «Магіла льва», добрасумленна выкананыя артыстам Тэатра Оперы і Балета М. Лазаравым, завяршылі другое аддзяленне канцэрта. Опера «Машэка» закончана толькі напалову. Опера, відаць, уяўляецца аўтару, як народнае відовішча ярка нацыянальнага характару, па тыпу ўкраінскіх опер «Наталка-Палтаўка» і «Запарожац за Дунаем».

Асноўная творчая задача — знайсці папулярную мову, якая была-б максімальна зразумелай шырокім масам і ў тойжа час перадавала-б складаную лінію развіцця сюжэта ў цікавай і яркай мастацкай форме.

Прадстаўленыя ў канцэрце дзве арыі Машэкі паказваюць, што аўтар знаходзіцца на правільным шляху. Параўноўваючы абедзве арыі, міжволі хочацца аддаць перавагу першай, больш тэмпераментнай і ўсхваляванай як па выкананню ў канцэрце, так і па свайму зместу і па арыгінальнай і цікавай музычнай мове.

Другое аддзяленне пачалося арыяй Радамеса з оперы Вердзі «Аіда» ў выкананні артыста Лазарава. На жаль, залішне хуткі тэмп выканання аднаго з лепшых лірычных твораў Вердзі не дазволіў раскрыць усю шматгранную прыгажосць гэтага твору. Затым былі выкананы тры творы Вагнера для сімфанічнага аркестра: уверцюра «Фауст», антракт з оперы «Лаэнгрын» і уверцюра да оперы «Тангейзер».

Адна частка з сімфоніі «Фауст», названая Вагнерам уверцюрай, належыць да характэрных рамантычных твораў 40—50-х гадоў мінулага стагоддзя.

Ідэя ўвасобіць у музыцы вобраз доктара Фаўста, займала розумы многіх кампазітараў. У рознай форме і індывідуальна падыходзілі яны да вялікага вобраза геніяльнага скептыка. Легенда аб доктары Фаусце, дзякуючы мноству розных музычных трактовак, прыняла цікавейшыя варыянты, якія рэзка адрозніваюцца адзін ад аднаго.

Вагнер задумаў свайго Фаўста ў форме вялікай рамантычнай сімфоніі. Але паспеў стварыць з яе толькі адну частку — музыку, якая раскрывае вобраз самога Фаўста. Твор гэты пабудаваны з рада асобных эпізодаў, звязаных адной агульнай ідэяй. На жаль, пры выкананні ў канцэрце гэтыя асобныя эпізоды, якія сімвалізуюць філасофскія шуканні—пытанні доктара Фаўста, аказаліся нязвязанымі ў адзіны сімфанічны вобраз.

Лепш удаліся аркестру антракт з оперы «Лаэнгрын» і уверцюра да оперы «Тангейзер». Але ў іх, як гэта ні дзіўна, вагнераўская музыка прагучала з падкрэсленымі элементамі цяжкога нямецкага каларыта, які ідзе яшчэ ад старой традыцыйнай музыкі ландскнехтаў і вахтпарадаў.

Такі «вынік» атрымаўся ад недастатковага валодання аркестрам пластыкай вядзення гука.

Было непрыемна слухаць «спрошчаныя рэдакцыі» гэтых двух выдатных вагнераўскіх уверцюр. Неабходна больш старанна прапрацаваць іх выкананне, бо ў творчасці Вагнера, аднаго з буйнейшых кампазітараў, для выканаўцаў тоўпіцца вялікія цяжкасці. Таму трэба прыкласці шмат працы, каб вагнераўская музыка прагучала гібкай і эмацыянальна-цікавай пры ўсім сваім складаным і цяжкім афармленні.

Дырыжор Тацяна Каламійцава, пад кіраўніцтвам якой прайшоў гэты складаны канцэрт, паспяхова справілася з сваёй задачай.

Як дырыжор, Каламійцава валодае безумоўнымі здольнасцямі і выдатнай памяццю. Увесь гэты канцэрт яна правяла напамяць. Хочацца пажадаць толькі, каб у яе выканаўчым майстэрстве з'явілася-б больш пластыкі і прывабнасці. Гэта датычыцца не толькі знешняга боку дырыжорскага гэсту, але хутчэй да самога метада трактоўкі выконваемых твораў.

А. ДЗІМІТРЫЕЎ.

Заслужаная артыстка РСФСР М. Г. Вікс за выкананне ролі Жэрмен дэ Курсі ў аперэце «Тытунёвы капітан» у Свярдлоўскім тэатры музычнай камедыі ў гэтым годзе атрымала званне лаўрэата Сталінскай прэміі. На нашым здымку: Засл. арт. РСФСР М. Г. Вікс у ролі Жэрмен дэ Курсі.

Навіны совецкага мастацтва

„Лясная песня“

Маскоўскі Дзяржаўны Тэатр імя Ленінскага Комсамола ў канцы красавіка паказаў маскоўскаму гледачу спектакль «Лясная песня»—Лесі Украінкі ў перакладзе М. Ісакоўскага. Пастаноўка спектакля—Засл. арт. РСФСР і УзССР С. В. Гіацынтавай. Спектакль уяўляе сабою драму-феерыю ў трох дзеях. Лясная дзяўчынка—Маўка, дачка Лесавіка, аддана кахае Лукаша. Лукаш здраджвае Маўцы і жэніцца на Акуліне. Маўка—лясная дзяўчынка, даведаўшыся пра здраду, вырашае пакінуць людзей і знікнуць... Агонь-Пералеснік помсціць Лукашу за яго здраду. Ён падпальвае яго хату, а самога Лукаша робіць ваўкалакам... Маўка ўсё-ж кахае Лукаша. Яна зноў ператварае яго ў чалавека, а сама робіцца лясной князёўнай... Такі змест гэтай чароўнай казкі Лесі Украінкі. Ролю Маўкі цудоўна выконвае артыстка Н. Кутасіна. Ролю Лукаша — А. Петрачэнка. Ролю Акуліны—артыстка Г. Клішко. Мастак спектакля—Е. Мандэльберг.

ПРЭМ'ЕРА Ў ТЭАТРЫ ЛЯЛЕК

Прэм'ера казкі Перо «Кот у ботах» з'яўляецца значным дасягненнем Дзяржаўнага тэатра лялек БССР, які вярнуўся да гэтага цікавага твору пасля спектакляў «Гусянё», «Цудоўны кошык», «Цудоўныя падарункі» і г. д.

У гэтым—галоўная заслуга мастацкага кіраўніка тэатра М. Бабушкіна, які, уладаючы кампазіцыйным чуццём, здолеў скампанаваць увесь змест казкі, што складаецца з 12 частак і крыху расцягнена, у шасці карцінах, прычым змест ад гэтага не прайграў. Наадварот, ён стаў больш дзейсным. Але, апрача гэтага, удумлівая работа мастацкага кіраўніка выявілася і ў кожным руху, гэсце, інтанацыі актора-лялькі.

Вялікім поспехам гледача карыстаецца артыст Замоўскі. Ён у ходзе спектакля выконвае дзве, зусім розныя па характару, цэнтральныя ролі—Караля і Велікана.

Трэба адзначыць і артыстаў Ляшчынскую (прынцэса Пецюця) і Чачыка (Жак, маркіз), якія стварылі яркія вобразы. Артыст Стружкін выконвае ролю Ката. Ён вельмі ўдала перадае дасціпны розум спрытнага слугі свайго пана.

Другім па свайму значэнню элементам у стварэнні цэласнага закончанага спектакля з'яўляецца мастацкае афармленне. Мастаку Звенігародскаму пашанцавала напісаць дэкарацыі, якія добра выяўляюць ідэю спектакля. Аднак, для большага эфекта патрэбна было-б лепш асвятліць сцэну, бо гэта-ж спектакль-казка. Без адпаведнага асвятлення няма поўнай яркай маляўнічасці.

Музыка, якая мае не меншае значэнне ў спектаклі, не зусім удала падабрана. Асабліва гэта адносіцца да ўступу, музыка якога, вясёлая, танцавальная, светлая па каларыту, не адпавядае зместу першай карціны.

Дзяржаўны тэатр лялек з'яўляецца адзіным тэатрам такога плану ў Беларусі. Тым больш здзіўляе нас адсутнасць мінімальнай увагі да яго з боку Кіраўніцтва па справах мастацтва пры Совеце Міністраў БССР, мясцовых арганізацый гор. Гомеля.

Тэатр знаходзіцца ў выключна цяжкіх умовах. Адсутнасць памяшкання для сістэматычных рэпетыцый дрэнна адбіваецца на творчай рабоце калектыва. Трэба сур'ёзна дапамагчы тэатру ў яго карыснай рабоце.

Н. ТАМАШОВА.

Засл. арт. БССР Б. Кудраўцаў у ролі Луконіна («Хлопец з нашага гораду» К. Сіманава).

Гастролі тэатраў БССР

Тэатральны аддзел Кіраўніцтва па справах мастацтва пры Совеце Міністраў БССР распрацаваў план летніх гастролей беларускіх драматычных тэатраў.

У Мінск прыязджае Дзяржаўны рускі драматычны тэатр БССР. Рускі драматычны тэатр за час ад 25 ліпеня па 25 жніўня паставіць на мінскай сцэне п'есы: «Цар Фёдар Іаанавіч» А. Талстога, «Тры сястры» А. Чэхава, «Дванаццатая ноч» В. Шэкспіра, «Дзеці сонца» М. Горкага і інш. У рэпертуары тэатра таксама п'есы сучасных совецкіх драматургаў: «Крэмлеўскія куранты» Н. Пагодзіна і «Самалёт спазняецца на суткі» Н. Рыбака і І. Саўчанкі. Затым тэатр будзе даваць гастролі ў Вільні і Клайпедзе.

Для школьнікаў тэатр лялек БССР летам пакажа «Кот у ботах» Г. Владычына і «Чараўнічае люстэрка» Тураўскага.

Бабруйскі абласны драматычны тэатр паставіць у Гродні і Магілеве спектаклі А. Астроўскага «Праўда добра, а шчасце лепш», Л. Хелман «Лісічкі», Ф. Шылера «Здрада і каханне» і інш. У Мозыр і Пінск выедзе Гомельскі абласны драматычны тэатр. У яго рэпертуары п'есы К. Гальдоні «Гаспадыня гасцініцы», А. Астроўскага «Позняе каханне» і інш.

Гледачы Мозыра і Гродні ўбачаць «Хто смяецца апошні» К. Крапівы, «Рускія людзі» К. Сіманава і рад іншых спектакляў у пастаноўцы палескага абласнога драматычнага тэатра.

На летнія гастролі ў Пінск паедзе Баранавіцкі абласны тэатр.

Рэдкалегія: Л. Александроўская, А. Багатыроў, Г. Глебаў, Якуб Колас, А. Куляшоў (адказны рэдактар), А. Кучар (намеснік адказнага рэдактара), П. Пестрак, Г. Таран.

АТ 02326 Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Рэвалюцыйная, 3. Друкарня «Чырвоны Друкар», Рэвалюцыйная, 12.